АРК


# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 4(54) 2007**

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія



*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Груцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Н...
В. М. ...
А. І. ...
В. Д...
В. Б. ...
А. І. ...
І. С. ...
В. М...



Весці БДПУ
сер2. n4. 2007


## Змест

### *Гісторыя*


*Шаўчук І.І.* Дынаміка колькаснага складу аспірантуры па гуманітарных дысцыплінах (20–30-я гг. ХХ ст.) ............ 3

*Здановіч У.В.* Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1990–2005 гг.) ............ 7

*Помазаў С.В.* Сацыяльны і нацыянальны склад навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў БССР у першай палове 1920-х гг. ............ 13

*Мініцкі М.І.* Гістарычныя адукацыйныя веды: роля кагнітыўных практык ............ 18

*Вуглік І.Р.* Сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі беларускага сялянства XVIII ст. ............ 22

*Русецкі С.В.* Вывучэнне традыцый дабрачыннасці ва ўсходніх славян у беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх даследаваннях XIX – пачатку XXI ст. ............ 25

*Атрушкевіч М.М.* Гільдзейскае заканадаўства ў Беларусі ў 20-я гг. XIX ст. ............ 30

*Лаўрыновіч Д.С.* Віленскія акцябрысты і іх саюзнікі ў пачатку ХХ ст. ............ 33

*Варабёў А.А.* Да пытання аб выніках выбараў ва Устаноўчы сход у Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні ............ 37

*Крывярот А.А.* Узаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызан (1941–1944): гістарыяграфія за 1941–1965 гг. ............ 40

*Вялікі А.Ф.* Савецка-польскае Пагадненне аб рэпатрыяцыі ад 25 сакавіка 1957 г. як нарматыўна-прававая база рэпатрыяцыі палякаў з БССР у Польшчу ............ 45

*Папоў М.А.* Дапаможныя біскупы Магілёўскага рымска-каталіцкага архібіскупства ў эпоху мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча (1773–1826 гг.) ............ 50

*Скарабагатая І.А.* Нацыянал-сацыялістычны рух у Аўстрыі (1920-я гг.) ............ 55


### *Філасофія*


*Кікель П.В., Абалевіч І.В.* Беларускі шлях развіцця: праблемы і перспектывы ............ 60

*Таркан І.І.* Канцэпцыі дыялога культур у рускай філасофскай думцы другой паловы ХХ ст. ............ 63

*Ігнатовіч А.Л.* Неасакратаўская размова ў кантэксце развіцця кагнітыўнай навукі другога пакалення ............ 66


### *Паліталогія*


*Сіманоўскі І.С.* Метады экстрапаляцыі і параўнальнага аналізу ...нарoдных адносін ............ 69


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ЛІТАРАТУРА
1. *Божык, П.* Зарубежная и международная экономическая политика / П. Божык. – Варшава: ГЭИ, 2004.
2. *Де Гортер, Х.* Export Subsidies: Agricultural Policy Reform and Developing Countries / Х. Де Гортер. – Washington: The World Bank, 2006.
3. *Ярош-Анговска, А.* Протекционистские аспекты торговой политики Европейского Союза в отрасли сельскохозяйственных продуктов / А. Ярош-Анговска. – Люблин: УМСК, 2003.
4. *Кругман, П.Р., Обстфельд, М.* Международная экономия. Теория и политика / П.Р. Кругман, М. Обстфельд. – Варшава: ГНИ, 2007. – Т. 1.
5. *Михалек, Й.* Торговая политика. Экономические механизмы и международное регулирование / Й. Михалек. – Варшава: ГНИ, 2002.
6. *Мисала, Й.* Современные теории международного обмена и зарубежной экономической политики / Й. Мисала. – Варшава: ШГТ, 2003.
7. *Невфармер, Р.* Trade, Doha, and Development. A Window into the Issues / Р. Невфармер. – Washington: The World Bank, 2006.
8. *Шлюеп, И., Де Гортер, Х.* The Definition of Export Subsidies and the Agreement on Agriculture / И. Шлюеп, Х. Де Гортер. -- Paper prepared for the World Bank's Agricultural Trade Group, 2000.
9. *Пшигодзка, Р.* Либерализация мировой сельскохозяйственной торговли и сельскохозяйственная политика Европейского Союза / Р. Пшигодзка // Научные Ежегодники СЕРиА. – Варшава-Познань, 2006. – Т. VIII. – Тетр. 4.
10. *Давыдзенка, А.Л.* Аналіз доступу на замежныя рынкі пасля Уругвайскага раунда: нетарыфныя ўмовы / А.Л. Давыдзенка // Весці БДПУ. – 2005. – № 1. – С. 121–125.

SUMMARY

*This article contains analysis of economic consequences of application of export grants in international trade. The special attention is given specificity of grants use in trade of agricultural production. The ninth Doha-round of trading negotiations of the countries-members of WTO, are passing now. One of questions discussed there consists of the forecast of possible consequences of the given step for participants of the international trading system.*

*УДК 330:37.018.4*

***Л.С. Кавальчук,***
***выкладчык кафедры эканамічнай тэорыі і эканамічнага выхавання БДПУ***

# БЕСПЕРАПЫННАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў СІСТЭМЕ ІНАВАЦЫЙНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ

Сацыяльна-эканамічныя, педагагічныя змяненні, якія адбываюцца ў рэспубліцы, патрабуюць абноўленай і больш складанай падрыхтоўкі навучэнцаў у межах эканамічнай адукацыі. Вышэйадзначанае выклікала абвостраны інтарэс да эканамічных ведаў. Веданне з'яў і законаў у эканоміцы, набыццё навыкаў самастойнага працоўнага жыцця, арганізацыі ўласнай справы становяцца не толькі агульнай культурай насельніцтва, але і яго практычнага жыцця.

Як паказаў аналіз вынікаў эканамічнай адукацыі школьнікаў, увядзенне ў вучэбныя планы школ, гімназій, ліцэяў спецыяльных курсаў па асновах эканамічных ведаў павысіла эканамічную пісьменнасць навучэнцаў, станоўча паўплывала на іх маральна-псіхалагічную і практычную падрыхтоўку да жыццядзейнасці ў рынкавых умовах.

Разам з тым вывучэнне эканомікі ў школах краіны сутыкаецца з шэрагам цяжкасцей, сярод якіх адсутнасць агульнапрынятага дзяржаўнага стандарту эканамічнай падрыхтоўкі навучэнцаў, тыпавых праграм і падручнікаў, іншых нарматыўных дакументаў.

Эканамічная адукацыя і выхаванне накіраваны на фарміраванне эканамічнага спосабу мыслення, выпрацоўку сістэмы эканамічнай дзейнасці і эканамічных паводзін і фарміраванне эканамічна значных якасцей асобы.

Першаступеннае значэнне мае здольнасць адукацыйнай сістэмы аператыўна і гібка рэагаваць на запыты грамадства, улічваючы асноўныя прыярытэты яго развіцця. Рэалізацыя дадзенай задачы не можа быць дасягнута шляхам укаранення новых тэхнічных сродкаў і новых тэхналогій. Важным фактарам пераводу адукацыйнай сістэмы Рэспублікі Беларусь у яе новую якасць з'яўляецца ўдасканаленне сістэмы бесперапыннай эканамічнай адукацыі, якая мае на мэце фарміраванне эканамічнага мыслення, а ў далейшым і эканамічных паводзін. Набытыя эканамічныя веды, уменні і навыкі, сфарміраванае эканамічнае мысленне з'яўляюцца вызначальным элементам інавацыйнага патэнцыялу краіны. Аналіз склаўшайся сітуацыі паказвае, што альтэрнатывы эканамічнай адукацыі ў навучальных установах няма. Веды і ўменні, набытыя ў рамках бесперапыннай эканамічнай адукацыі, даюць магчымасць паспяхова рашаць праблемы, якія ўзнікаюць у моладзі ў перыяд выбару прафесіі (прафесійнае самавызначэнне), адаптацыі да ўмоў канкурэнтнага рынку працы і атрымання сацыяльнай абароненасці ад негатыўных бакоў паўсядзённага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гэтыя змяненні ўсё глыбей укараняюцца ў сістэму і працэсы кіравання і патрабуюць удасканалення метадалогіі і арганізацыйных структур, а таксама ўкаранення новых сродкаў і рычагоў рэгулявання чалавечай дзейнасці.

Аб'ектыўнай патрэбай і заканамернай рэакцыяй на складваючуюся сітуацыю ў бесперапыннай эканамічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца распрацоўка і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацый, якія маюць на мэце аптымізацыю якасці работы ўсяго эканамічнага механізма краіны ў цэлым. Таму бесперапынная эканамічная адукацыя адыгрывае галоўную ролю ў забеспячэнні эканамічнага росту і развіцця ўзнаўленчых працэсаў за кошт актывізацыі інвестыцый у чалавека і стварэння інтэлектуальнага капіталу, што вызначае арыенціры яго ўдасканалення на многія гады наперад.

У краінах, чый рыначны стаж налічвае не адно дзесяцігоддзе, даўно прыйшлі да высновы, што пры правільнай адукацыі гэтыя поспехі могуць быць значна большымі. Сур'ёзную падрыхтоўку да бізнес-будучыні там пачынаюць са школьнай парты ці нават раней. У сучаснай бізнес-адукацыі выдзяляюцца два падыходы: пры першым, традыцыйным, школы і ВНУ прапануюць маладым людзям праграмы, якія навучаюць таму, як адкрываць бізнес і кіраваць ім; пры другім, найноўшым, падыходзе профільнае навучанне заключаецца галоўным чынам у выпрацоўцы набору якасцей, якія складаюць аснову асобы прадпрымальніка, такіх, як наватарскае мысленне, ініцыятыўнасць, сіла волі. Важна пачынаць профільную падрыхтоўку ўжо ў пачатковай школе, бо ў раннім узросце дзеці лепш успрымаюць новыя ідэі, у іх прасцей сфарміраваць прадпрымальніцкі стыль мыслення. Магчымасці бізнес-спецыялізацыі школьнікаў звязаны не толькі з прыватнымі школамі. У дзяржаўных гімназіях і школах 4,7% спецыялізаваных класаў маюць эканамічны ўхіл, на эканамічнай падрыхтоўцы спецыялізуецца мінская школа № 45.

Сучасная адукацыя мае два вектары, якія накіраваны і ў бок эканомікі, і ў бок сацыяльнай сферы. Канчатковымі прадуктамі дзейнасці сістэмы адукацыі з'яўляюцца чалавечы капітал, узоры паводзін, высокакваліфікаваная рабочая сіла, новыя веды, новая тэхналогія, інфармацыя, якая адначасова ўплывае на стан актуальнага асяроддзя (сацыяльныя інстытуты), змяняючы яго, павышаючы яго якасць, і на спажыўцоў (насельніцтва, дзяржаву, работадаўцаў, заказчыкаў НІОКР, заказчыкаў тэхналогій, заказчыкаў новай прадукцыі і паслуг, заказчыкаў прагнозаў экспертных ацэнак і г. д.). Адукацыя ў цэлым, вышэйшая школа, універсітэты маюць самыя вялікія магчымасці ў фарміраванні базісу інавацыйнай эканомікі.

Адной з важных задач эканамічнай адукацыі з'яўляецца навучанне чалавека самастойнаму асэнсаванню рэчаіснасці. Адукацыя ў цэлым па сваёй сутнасці з'яўляецца гуманітарнай мадэллю жыццядзейнасці чалавека, якая дазваляе атрымаць сістэмныя веды аб заканамерных узаемасувязях чалавека з прыродай, культурай, грамадствам, дзяржавай, аб працэсах станаўлення асобы, развіваючыхся ў свеце каштоўнасцей, у адносінах да іншага і да самога сябе і г. д. У гэтай сувязі асобую значнасць набывае выпрацоўка разумных патрэб.

Сучасныя падыходы да прафарыентацыі моладзі будуюцца на аснове канцэпцыі, якая прадугледжвае змяненне, развіццё і фарміраванне шэрага характарыстык прафпрыгоднасці, выпрацоўку індывідуальнага стылю дзейнасці, кампенсацыю не хапаючых прафесійна важных якасцей.

Эканамічная адукацыя – гэта працэс уваходжання маладой асобы ў эканамічныя адносіны, якія існуюць і развіваюцца, адаптацыя да іх, засваенне сацыяльных роляў суб'ектаў гэтых адносін – працаўніка, уласніка, спажыўца, удзельніка абмену і размеркавання. Несумненна, што ўсяму гэтаму неабходна вучыць, пачынаючы з дзяцінства. Навуковыя даследаванні і перадавы педагагічны вопыт паказалі, што 6-гадовы ўзрост з'яўляецца найбольш прымальным для разумовага развіцця і навучання, а таксама для набыцця сацыяльнага вопыту, што вельмі важна для паспяховага засваення дзецьмі даступных ведаў па эканоміцы. Пры вызначэнні даступнасці для дашкольнікаў ведаў па эканоміцы неабходна ўлічваць фізіялагічныя, псіхалагічныя, узроставыя асаблівасці дзяцей 5–6-гадовага ўзросту. Сістэмаўтвараючым элементам забеспячэння пераемнасці паміж ступенямі адукацыі ў мэтах, змесце, метадах, формах і сродках навучання і выхавання служыць узроставая перыядызацыя развіцця асобы, першым этапам якой з'яўляецца дашкольнае дзяцінства. Дашкольны ўзрост – перыяд далучэння дзяцей да свету культуры, агульначалавечых каштоўнасцей, перыяд устанаўлення пачатковых адносін са светам людзей, прыроды, прадметаў і ўласным унутраным светам. Дзеці павінны быць у пэўнай ступені падрыхтаваны да сістэмнага школьнага навучання. Жаданне школы мець справу з добра падрыхтаванымі дзецьмі выклікае пэўныя патрабаванні да дзіцячых дашкольных устаноў з боку бацькоў, якія жадаюць, каб іх дзіця паступіла ў прэстыжную школу і паспяхова ў ёй займалася. Элементарныя эканамічныя веды неабходны для больш поўнага, усебаковага развіцця асобы дашкольніка і падрыхтоўкі яго да навучання ў школе. Можна з упэўненасцю гаварыць, што альтэрнатывы эканамічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адукацыі ў навучальных установах няма. Веды і ўменні, набытыя ў школе, дапамагаюць паспяхова вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць перад моладдзю ў перыяд выбару прафесіі, адаптацыі да ўмоў канкурэнтнага рынку працы і атрымання сацыяльнай абароны ад негатыўных бакоў паўсядзённага жыцця. Менавіта з гэтай мэтай ствараюцца адпаведныя ўмовы, а таксама розныя мадэлі эканамічнай адукацыі ў залежнасці ад патрэб і назначэння таго ці іншага звяна адукацыйнай сістэмы. Адной з такіх мадэлей з'яўляецца агульнаадукацыйная школа. Галоўнай асаблівасцю дадзенай мадэлі з'яўляецца тое, што эканамічныя веды ўваходзяць у склад розных адукацыйных сфер і прадметаў на базе шырокага выкарыстання міжпрадметных сувязей.

Такім чынам, практыка паказвае (не адмаўляючы прадметных сувязей), што найбольш эфектыўным з'яўляецца ўвядзенне ў базісны вучэбны план у якасці інтэграванага курса «Асноў эканомікі». У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць распрацоўкі цэласнай праграмы названага курса, стварэння сістэмы арганізацыі эканамічнай адукацыі і выхавання. Нават пры адсутнасці такога курса ўзнікае патрэба мець у кожнай школе канцэнтраваныя праграмы, створаныя на базе міжпрадметных сувязей. Гэта дасць магчымасць забяспечыць адзіную змястоўную лінію, а таксама больш кваліфікаванае кіраванне праблемай эканамічнай адукацыі навучэнцаў, зменшыць дубліраванне вучэбнага матэрыялу, здзейсніць пераемнасць зместу і арганізацыі навучання з класа ў клас і перайсці да комплекснага ўкаранення ў школе эканамічных ведаў, уменняў, навыкаў, сувязей з іншымі галінамі ведаў. У кожнай школе неабходна перыядычна праводзіць з настаўнікамі гісторыі, геаграфіі, матэматыкі, інфарматыкі спецыяльныя семінары па паглыбленні імі эканамічных ведаў для таго, каб палепшыць якасць і эфектыўнасць урокаў з эканамічным зместам. Сёння не проста пісьменны, але толькі добра адукаваны чалавек здольны зразумець сапраўдныя, надзейна схаваныя ад недасведчанага позірку глыбінныя прычыны беднасці і эканамічнай няроўнасці як асобных людзей, так і цэлых краін, рэгіёнаў і кантынентаў планеты.

*SUMMARY*

*In the article the essence of continued economic education is examined. It has a primary role in the economic growth and development of reproduced processes at the expense of increased investment in human and intellectual capital that determines the direction for improvement in the years ahead.*

*The article discusses the main approaches to economic education. Attention is drawn to the increasing importance of economic education, the aim of which is to create economic thinking and eventually economic behaviour.*

*УДК 332(476)*

***А.І. Літвінюк,***
***аспірант кафедры эканамічнай тэорыі і эканамічнага выхавання БДПУ***

## НАПРАМКІ І ПРЫЯРЫТЭТЫ ЎВАХОДЖАННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У СІСТЭМУ ТРАНСГРАНІЧНЫХ СУВЯЗЕЙ

З моманту ўзнікнення на граніцах Рэспублікі Беларусь першых арганізацыйных форм трансгранічнага супрацоўніцтва прайшло нямала часу. Аднак ужо можна зафіксаваць некалькі канкрэтных прыкладаў і абагульніць вопыт узаемадзеяння ў розных галінах.

Асноўнымі напрамкамі ўзаемадзеяння, заяўленымі пры стварэнні форм трансгранічнага супрацоўніцтва, з'яўляецца аб'яднанне намаганняў у:

• эканамічным супрацоўніцтве (гандлёвай, інвестыцыйнай, фінансавай, турыстычнай дзейнасці, здабываючай, лесанарыхтоўчай, лесапеапрацоўчай, лёгкай, харчовай прамысловасці, сельскай гаспадарцы);

• развіцці сацыяльнай, інфармацыйнай і вытворчай інфраструктуры, будаўніцтве і мадэрнізацыі інфраструктуры граніцы, транспартнай сеткі;

• гарманізацыі міжнацыянальных адносін;

• навуковым і культурным супрацоўніцтве (абмен спецыялістамі, агульныя мерапрыемствы па захаванні гістарычных і культурных помнікаў, ахова здароўя, рэкрэацыя, фізкультура і спорт, інфармацыйны абмен, навуковыя даследаванні, адукацыя);

• ахове навакольнага прыроднага асяроддзя (прадухіленне і ліквідацыя наступстваў стыхійных бедстваў, у тым ліку абарона ад затаплення і падтаплення талымі водамі на пагранічных вадасцёках і вадаёмах, забеспячэнне рэжыму рацыянальнага прыродакарыстання, паляпшэнне экалагічнай сітуацыі);

• арганізаваным узаемадзеянні і абмене вопытам паміж органамі выканаўчай улады і мясцовага самакіравання, агульнай барацьбе з крымінальнымі злачынствамі і правапарушэннямі.

Найбольш часта выкарыстоўваемай формай трансгранічных сувязей, у якой еўрарэгіё-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ